# Гэтых дзён не змоўкне слава

У гады Вялікай Айчыннай вайны нямала слаўных старонак у гісторыю подзвігаў упісалі камсамольцы. Маладыя патрыёты, якія дзейнічалі на тэрыторыі нашага раёна, вялі бязлітасную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яны знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага, актыўна ўдзельнічалі ў падполлі. Вось некаторыя іх подзвігі.

Тры партызаны Мінскага злучэння пад камандай камсамольца Зеневіча атрымалі заданне правесці разведку ў вёсцы Бярозаўка. На зваротным шляху група напаткала атрад з 70 гітлераўцаў. Партызаны адкрылі агонь па ворагу. 18 гітлераўскіх салдат і адзін афіцэр былі забіты. У камсамольцаў канчаліся патроны, а азвярэлыя ворагі прадаўжалі атаку за атакай. Двое партызан былі забіты, а камандзір групы Зяневіч працягваў страляць з пісталета. Апошні патрон ён збярог для сябе.

Многа мужнасці, вытрымкі і вынаходлівасці праявіў партызанскі разведчык камсамолец Эдуард Нордман. Натрапіўшы на групу паліцэйскіх ля вёскі Паварчыцы, ён пецярых абяззброіў і вярнуўся ў атрад.

Быў такі выпадак. У вёсцы Даманавічы фашысты захапілі камсамольцаў Івана і Аляксея Хаміцэвічаў і Арыновіча, звязалі ім рукі і пад канвоем адправілі ў вёску Морач на допыт. Іх пасадзілі ў склеп. Набліжалася раніца, а з ёй і смерць. Тады камсамольцы зубамі перагрызлі аднаму таварышу вяроўку на руках, а ён развязаў рукі астатнім. Затым зрабілі падкоп пад сцяной і вярнуліся ў атрад, каб з новай сілай біць фашысцкіх захопнікаў.

Старобінская раённая падпольная газета «Савецкі патрыёт» у нумары ад 21 кастрычніка 1943 года пісала: «У атрадзе імя Гуляева камсамольцы жорстка помсцяць фашыстам за кроў і слёзы, пралітыя нашым народам. Камсамольцы Белякоў, Дробаў, Жураўлёў, Говыкаў, Кідзін, Бярозін, Папоў, Лугін, Кашэль і цэлы рад другіх баявых таварышаў праяўляюць гераізм і адвагу ў барацьбе з ворагам. У атрадзе большасць моладзі з радоў камсамола. Камсамольцы за два гады знішчылі да 500 нямецкіх салдат і афіцэраў, спалілі дзве аўтамашыны з нямецкімі салдатамі, знішчалі да 40 кіламетраў тэлефоннай лініі, спалілі 6 мастоў, пусцілі пад адхон два эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага. Многа і другіх баявых спраў на рахунку маладых народных мсціўцаў партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага».

Гераічныя подзвігі камсамольцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны будуць вечна жыць у сэрцах савецкіх людзей.

**Н. КЛЮЧАНОВІЧ.**

**БУДАЎНІК КАМУНІЗМА**
**2 стар. 27 чэрвеня 1964 г.**

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ … СОЛИГОРСКА